Вучэбнае выданне

Корзюк Аляксандр Аляксандравіч

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў 7 КЛАСЕ

Вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў
установаў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

Рэдактар *В. М. Іваноў*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Камп'ютарная вёрстка *А. У. Смалю*
Карэктары *В. Р. Ермаковіч, Н. Б. Кузмель*

Падпісана ў друк 10.03.2018. Фармат 60×84 1/16. Паперa афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 9,5. Ул.-выд. арк. 8,00.
Тыраж 2530 экз. Заказ 4.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014, № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

А. А. Корзюк

ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў 7 КЛАСЕ

Вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў
установаў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

Рэкамендавана
Навукова-метадычнай установай
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Параметры параўнання	Гістарычны перыяд	
	другая палова XVII ст.	першая палова XVIII ст.
Палітычнае становішча		
Сацыяльна-эканамічнае становішча		
Духоўныя працэсы		

5. Сістэматызуйце знешнепалітычныя падзеі сярэдзіны XVII — першай паловы XVIII ст. і зрабіце выснову аб месцы і ролі Рэчы Паспалітай ва Усходняй Еўропе.

Узаемаадносіны з Расіяй	Узаемаадносіны са Швецыяй	Узаемаадносіны з Турцыяй

6. Вызначце прычыны і вынікі наступных гістарычных падзей і з'яў:
а) казацкі рух у Беларусі;
б) вайна 1654—1667 гг.;
в) Кейданская унія 1655 г.;
г) Паўночная вайна 1700—1721 гг. на тэрыторыі Беларусі;
д) эканамічны заняпад у другой палове XVII — пачатку XVIII ст.;
е) барока ў культуры Беларусі.

У канцы ўрока на аснове выкананых задачняў сумесна з настаўнікам фармулюецца выснова аб асноўным гістарычным змесце другой паловы XVII — першай паловы XVIII ст. для беларускіх зямель і значэнні дадзенага перыяду ў айчыннай гісторыі.

Пры падвядзенні ***вынікаў урока*** для асэнсавання вучнямі ўласнай дзейнасці на **этапе рэфлексіі** настаўнік можа арганізаваць абмеркаванне працы вучняў: яны ацэньваюць свой уклад у дасягненне пастаўленых мэт урока, актыўнасць, эфектыўнасць уласнай працы і працы класа. Вучні выказваюцца коратка, адным сказам, вы-

біраючы яго пачатак з магчымага спісу на дошцы: «Было цікава...», «Я змог...», «Мяне здзівіла...», «Было складана...», «Мяне ўразіла...», «Мяне засмуціла...» і г. д.

Дамашняе заданне: паўтарыць § 22.

Раздзел IV. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII ст.

Тэма 23. ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ

Дыдактычная мэта ўрока

Вучні павінны ведаць:

• азначэнне паняцця *рэформа*;

перадумовы, сутнасць і вынікі аграрнай рэформы А. Тызенгаўза.

Вучні павінны ўмець:

• вызначаць змены, якія адбыліся ў эканоміцы беларускіх зямель у другой палове XVIII ст.;

• вызначаць асаблівасці развіцця гарадоў і сельскай гаспадаркі; характарызаваць магнацкае прадпрымальніцтва.

Задачы асобаснага развіцця

• **Развіццёвая:** спрыяць развіццю ўменняў аналізаваць гістарычныя з'явы, раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж імі, вызначаць месцазнаходжанне на карце падзей, якія вывучаюцца.

• **Выхаваўчая:** садзейнічаць выхаванню эканамічнай культуры вучняў.

Тып урока — урок вывучэння новага матэрыялу.

Прыкладны ход урока

Паколькі дадзены ўрок адкрывае вывучэнне новага раздзела, метадычна мэтазгодным будзе правядзенне ***актуалізацыі апорных ведаў*** вучняў па дадзенай тэме. Для гэтага на папярэднім уроку ім было дадзена заданне паўтарыць § 22. У якасці пытанняў для гутаркі можна прапанаваць наступныя.

• Успомніце азначэнні паняццяў *фальварак, валочная памера, мануфактура*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ